# РЭЛІГІІ НА БЕЛАРУСІ: СТАНАЎЛЕННЕ, СУЧАСНАЕ СТАНОВІШЧА, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

*УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*
*Варанец А.В., 2к., 2гр., МПФ*
*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*

Ні для каго не сакрэт, што рэлігія з даўніх часоў займае вельмі важнае месца ў гісторыі і культуры кожнага народа любой краіны. Не выключэнне і Беларусь. Таму здаецца вельмі цікавым разабрацца ў сучасным становішчы рэлігій у нашай краіне і вызначыць перспектывы іх развіцця і папулярызацыі.

Спачатку прасочым гістарычны шлях асноўных веравызнанняў на Беларусі і паглядзім на іх сучасны стан.

**Праваслаўе** з'яўляецца найстаражытнейшай хрысціянскай канфесіяй на беларускіх землях. Яно прыйшло сюды ў канцы Хст. са станаўленнем Полацкай епіскапскай кафедры (992г.). На пачатку другога тысячагоддзя вызначыліся асноўныя сферы дзейнасці праваслаўнай царквы, узнікла царкоўнае землеўладанне, сфарміравалася епархіяльная структура. Полацкая, Тураўская і іншыя епархіі, у склад якіх у розныя часы ўваходзілі беларускія землі, былі падпарадкаваны Кіеўскай мітраполіі, якая да сярэдзіны XVст. захоўвала адноснае адзінства. У 1472г. праваслаўная царква Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы атрымала кананічнае прызнанне Канстанцінопальскага патрыярха. У канцы XIII – сярэдзіне XVIст. на тэрыторыі Беларусі заснавана каля 40 праваслаўных манастыроў, некаторыя з іх сталі цэнтрамі царкоўна-рэлігійнага жыцця, адукацыі, іканапісу. Пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі (1596г.) праваслаўная царква на беларускіх землях апынулася ў цяжкім становішчы. Затым вальны сейм Рэчы Паспалітай 1632г. і прывілеі караля Уладзіслава IV санкцыянавалі афіцыйнае ўзнаўленне дзейнасці праваслаўнай беларуска-ўкраінскай духоўнай іерархіі. Былі створаны праваслаўныя епархіі з цэнтрамі ў Луцку, Пярэмышлі, Львове і Магілёве. Апошняя з сярэдзіны XVIIст. часта называлася Беларускай і да пачатку XVIIIст. заставалася адзінай праваслаўнай епархіяй у Рэчы Паспалітай. Пасля далучэння беларускіх земляў да Расійскай імперыі ў адносінах праваслаўнай царквы пачынаюць дзейнічаць агульнарасійскія законы. У пачатку XXст. ў Беларусі было 5 праваслаўных епархій: Гродзенская, Мінская, Магілёўская, Літоўская (ахоплівала Віленскую і Ковенскую губерніі), Полацкая. Устанаўленне Савецкай улады значна аслабіла ролю праваслаўнай царквы ў грамадстве. Дакрэтам "Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы" (23.10.1918) рэлігійныя арганізацыі ператвараліся ў прыватныя абшчыны вернікаў, якія існавалі выключна на свае сродкі. І толькі з канца 80-х гадоў пачалося новае рэлігійнае адраджэнне. У 1989г. створаны Экзархат Беларускай праваслаўнай царквы Маскоўскага патрыярхату. Утворана 10 епархій. У цяперашні час Беларуская праваслаўная царква аб'ядноўвае 1349 прыходаў. У 2005г.



Репозиторий ГрГМУ

была заснавана новая Бабруйска-Быхаўская епархія. Дзейнічаюць 1159 праваслаўных храмаў, яшчэ 188 знаходзяцца ў стадыі будаўніцтва. За апошняе дзесяцігоддзе Беларускай праваслаўнай царкве перададзена 810 культавых і іншых будынкаў. Беларуская праваслаўная царква ажыццяўляе вялікую работу па духоўна-маральным адраджэнні беларускага грамадства. Рэалізуюцца 14 праграм узаемадзеяння з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання. Праваслаўная царква аказвае вялікую дапамогу дзіцячым дамам, дамам для састарэлых і інвалідаў, а таксама тым, што маюць патрэбу ў дапамозе на даму. Гэтай дзейнасцю займаюцца рэлігійныя брацтвы, сястрычаствы. Пры Беларускім Экзархаце створана праваслаўнае брацтва ўрачоў, яно аказвае бясплатную медыцынскую дапамогу інвалідам і састарэлым. Праваслаўная царква, якая аб'ядноўвае больш за 80% вернікаў у рэспубліцы, складае аснову рэлігійнага жыцця краіны, канфесіянальнай стабільнасці, верацярпімасці і бесканфліктнасці.

**Рымска-каталіцкая царква** – з'яўляецца другой па колькасці вернікаў канфесіяй. Каталіцтва афіцыйна прыйшло на Беларусь у канцы XIVст. У 1387г. прывілеем Ягайлы было заснавана Віленскае біскупства, якое ахоплівала, разам з іншымі, амаль усе беларускія землі. З канца XIVст. былі створаны 259 парафій (прыходаў). Узнікаюць першыя каталіцкія манаскія ордэны: францысканцаў (Ліда, Старыя Ашмяны, Пінск), аўгусцінцаў (Брэст, Быстрыца), бернардынцаў (Полацк). У XVI – XVIIIст. на Беларусі дзейнічалі 18 мужчынскіх і 7 жаночых каталіцкіх ордэнаў, сярод якіх асабліва выдзяляўся ордэн езуітаў. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі была створана ў 1773г. Беларуская каталіцкая епархія з цэнтрам у Магілёве. Каталіцкае духавенства прымала актыўны ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху XIXст., за што падвяргалася рэпрэсіям з боку ўрада Расійскай імперыі: адбывалася закрыццё каталіцкіх касцёлаў і манастыроў, прымусовы перавод веруючых católікоў у праваслаўе, ссылка і пакаранне смерцю ксяндзоў-удзельнікаў паўстанняў і інш. Пры Савецкай уладзе прававое становішча каталіцкай царквы не адрознівалася ад праваслаўнай. Каталіцкае духавенства, як і праваслаўнае, моцна пацярпела ад рэпрэсій. Што да Заходняй Беларусі, якая знаходзілася пад уладай Польшчы, тут становішча каталіцкай царквы было іншым да 1939г. У гады Вялікай Айчыннай вайны каталіцкае духавенства падтрымлівала Армію Краёву. Пасля вайны больш за 300 ксяндзоў, ратуючыся ад праследу Савецкай улады, выехалі ў Польшчу. У канцы 1980-х гадоў пачалося кананічнае афармленне каталіцкай царквы ў Беларусі. У 1989г. была ўтворана Беларуская каталіцкая епархія. У 1991г. на тэрыторыі Беларусі створаны 3 рымска-каталіцкія епархіі: Гродзенская, Пінская, Мінска-Магілёўская. У цяперашні час рымска-каталіцкая царква аб'ядноўвае 438 абшчын. У рэспубліцы дзейнічаюць 4 рымска-каталіцкія епархіі і Канферэнцыя каталіцкіх епіскапаў, 8 манастыроў, 9 рэлігійных місій. Акрамя гэтага, працуюць дзве вышэйшыя каталіцкія духоўныя семінарыі. На сённяшні час епархіі маюць у наяўнасці 427 культавых збудаванняў, з якіх 194 з'яўляюцца помнікамі гісторыі і архітэктуры, значная колькасць касцёлаў рэстаўрыруецца і рамантуецца, будуюцца больш за 40 касцёлаў. Каталіцкая царква актыўна займаецца дабрачыннасцю.



Рэпазіторый ГрГМУ

Важную ролю ў гэтым адыгрывае арганізацыя «Карытас», аддзяленні якой адкрыты ва ўсіх епархіях. Яны дзейнічаюць па спецыяльных праграмах: праект «Дзеці», праект «Калядныя канікулы», праект «Тыдзень міласэрнасці» і інш.

**Пратэстантызм** з другой паловы XVIст. адыгрываў своеасаблівую ролю ў палітычным, царкоўна-рэлігійным і культурным жыцці Беларусі. Разнастайнасць сацыяльных сіл, уцягнутых у Рэфармацыю і іх палітычных мэт, абумовілі розныя рэфармацыйныя рухі ў Вялікім Княстве Літоўскім – кальвінізм, лютэранства, антытрынітарызм. На тэрыторыі Беларусі першыя рэфармацыйныя абшчыны з'явіліся ў Брэсце, Нясвіжы, Клецку, Заслаўі, Мінску, Полацку. Да сярэдзіны XVIIст. былі створаны каля 85 кальвінісцкіх, 7 арыянскіх, некалькі лютэранскіх абшчын. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі становішча пратэстанцкай царквы змянілася мала. Кальвіністы аб'ядноўваліся вакол Віленскага евангеліка-рэфармацкага Сінода (да 1840г. – Літоўскі), лютэране – Курляндскай евангеліка-лютэранскай кансісторыі. З канца XIXст. у Беларусі распаўсюджваецца пратэстанцкае сектанцтва: баптызм, штундызм, евангелічнае хрысціянства, адвентызм 7-га дня і інш. Пратэстантызм у рэспубліцы на сённяшні дзень прадстаўлены 14 напрамкамі, якія аб'ядноўваюць 972 рэлігійныя абшчыны (33,6 працэнты ад агульнай колькасці абшчын у рэспубліцы), колькасць прыхільнікаў якіх складае каля 2 працэнтаў ад колькасці вернікаў у краіне. Сярод іх найбольш шматлікімі з'яўляюцца хрысціяне веры евангельскай (488 абшчын).

**Стараверства.** Першыя звесткі аб староверах у Беларусі адносяцца да другой паловы XVIIст. Уцёкшыя з Расіі староверы заснавалі ў 1685г. стараверскую слабаду ў Ветцы, якая ў хуткім часе становіцца цэнтрам стараверства папоўскага (беглапапоўскага) напрамку. У 1764г. Ветка была спустошана, і гэтая яе роля перайшла да Старадуб'я. Беспапоўскі напрамак у Беларусі быў прадстаўлены 3 толкамі: паморскім, федасееўскім і філіпонаўскім. У савецкі перыяд у стараверстве ў Беларусі адбываюцца істотныя змены: скрачаецца колькасць абшчын, назіраецца адток вернікаў, адбываецца сціранне адрозненняў паміж стараверскімі толкамі і напрамкамі. Стараверства страчвае сваю традыцыйную апазіцыйнасць. У апошнія гады назіраецца некаторая актыўнасць старавераў. Цяпер у рэспубліцы ёсць стараверскае Старажытнаправаслаўнае рэлігійнае аб'яднанне, у якое ўваходзяць 27 абшчын паморскага кшталту і 10 стараверскіх абшчын рознага кшталту, якія дзейнічаюць аўтаномна.

**Іслама** ў Беларусі прытрымліваецца татарскае насельніцтва. Пранікненне татар-мусульман на тэрыторыю Беларусі пачалося ў канцы XIVст., калі вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Вітаўт запрасіў іх на ваенную службу. У той жа час з'яўляюцца і першыя мячэці. Татары ў Беларусі прытрымліваюцца галоўным чынам ісламу суніцкага напрамку. У 1591г. у Рэчы Паспалітай пражывалі каля 100 тысяч татар, дзейнічалі каля 400 мячэцей. Да пачатку XVIIIст. колькасць татар-мусульман у выніку працэсу асіміляцыі скарацілася да 30 тысяч. Згодна з перапісам 1897г., у Беларусі пражывалі каля 9,6 тыс. мусульман. Пасля 1917г. і савецка-польскай вайны большасць татар апынулася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1925г. у Вільні яны ўтварылі Муфтыят і аб'явілі аўтакефалію.

Репозиторий ГрГМУ

Пасля Вялікай Айчыннай вайны савецкія ўлады пачалі закрываць мячэці. Засталася дзеючай толькі адна мячэць – у Іўі. З канца 1980-х гадоў назіраецца ажыўленне рэлігійнага і грамадска-культурнага жыцця татар-мусульман. У 1994г. створаны самастойны Муфтыят Рэспублікі Беларусь. Сёння ў рэспубліцы зарэгістраваны 27 мусульманскіх абшчын і адно мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне.

**Іудаізм** – нацыянальная рэлігія яўрэяў, якія ўладкаваліся на Беларусі ў XIVст. Першыя звесткі аб пасяленні яўрэяў – гэта акты аб прывілеях 1388–1389гг. вялікага князя Вітаўта, дадзеныя 5 яўрэйскім абшчынам: у Троках, Брэсце, Гродне, Луцку, Уладзіміра-Валынскім. Культ і абраднасць беларускіх яўрэяў мала чым адрозніваецца ад таго культу, які ўласцівы яўрэям іншых краін. Культавымі цэнтрамі іўдзеяў з'яўляюцца сінагогі і малітоўныя дамы. Па законах Расійскай імперыі малітоўныя дамы дазвалялася адкрываць на кожныя 30 яўрэйскіх дамоў, сінагогі – на 80 за кошт вернікаў. З XIVст. у Беларусі вядомыя рэлігійныя яўрэйскія навучальныя ўстановы – ешыботы (старажытнейшая – у Брэсце). У XVIIIст. на тэрыторыю Беларусі пранікае містычная рэлігійная плынь – хасідызм, якая прыняла тут самабытную форму – хабад. Прымірэнне паміж хасідамі і прыхільнікамі артадаксальнага равінізму ў XIXст. тлумачыцца ўмяшаннем улад і неабходнасцю аб'яднання сіл супраць новай плыні – гаскалах (рух яўрэйскай адукаванай часткі насельніцтва за свецкасць адукацыі, супраць традыцыйнай "архаічнай" рэлігіі і мовы). Пасля 1917г. роля іўдаізму ў жыцці беларускіх яўрэяў значна паменшылася. Ешыботы і хедары (пачатковыя рэлігійныя школы) спынілі сваю дзейнасць, сінагогі і малітоўныя дамы закрываліся. Адраджэнне рэлігійнага жыцця пачалося з канца 1980-х гадоў. Цяпер у Беларусі дзейнічаюць 24 іўдзейскія абшчыны і 2 рэлігійныя аб'яднанні.

Увогуле, на 1 верасня 2006г. ў рэспубліцы дзейнічалі 3030 рэлігійных арганізацый, у тым ліку 2886 рэлігійных абшчын, 144 рэлігійныя арганізацыі рэспубліканскага і агульнаканфесіянальнага значэння (епархіі, манастыры, брацтвы, місіі, духоўныя навучальныя ўстановы), 25 канфесій і рэлігійных напрамкаў. Талерантнае прыняцце Беларускай дзяржавай поліканфесіянальнай мадэлі забяспечвае роўныя правы заходняй і ўсходняй традыцыям, дае магчымасць захавання міру і стабільнасці на беларускай зямлі. Міжканфесіянальнай згодзе садзейнічае Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей, які падпарадкоўваецца Ураду Рэспублікі Беларусь.

Але ж ёсць і цяжкасці ў рэлігійным пытанні на Беларусі. Вельмі яўна прагледжваецца тэндэнцыя не толькі ў нас, але ж і ў большасці краін свету, – моладзь адыходзіць ад рэлігіі, усё менш і менш цікавіцца духоўным, аддае перавагу матэрыяльнаму. Гэтаму вельмі спрыяе навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая вялікімі крокамі працягвае ісці па Зямлі, а так сама ўрбанізацыя, маральная дэградацыя сучаснага грамадства і многае іншае. Таму здаецца вельмі актуальнай папулярызацыя ўладамі краіны асноўных веравызнанняў сярод моладзі шляхамі, напрылад, правядзення розных акцый, сустрэч моладзі з прадстаўнікамі царквы, увядзення курсу рэлігазнаўства ў школе, які бы поўна апісваў усе веравызнанні, а не толькі праваслаўе, і інш. Увогуле, на мой погляд, усе сучасныя сусветныя рэлігіі патрабуюць рэфармацыі, каб



Рэпазіторый ГрГМУ

паспяхова існаваць ў нашым, вельмі неадназначным і складаным грамадстве. Патрабуецца іх адаптацыя да сучаснасці. Усё звышпералічанае неабходна, таму што вельмі яўна сярод моладзі прагледжваецца тэндэнцыя развіцця агностыцызму і заняпаду рэлігіі. А без веры ў нешта нематэрыяльна высокае, духоўна дасканалае грамадства становіцца небяспечным, яно папросту дэградуе.

## РЭЛІГІЙНЫЯ ПОГЛЯДЫ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

*УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*
*Кулісевіч Г.А., 4к., 5гр., ЛФ*
*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*

Дбаючы пра адраджэнне роднага краю, уступленне яго на шлях самабытнага нацыянальнага развіцця, Максім Багдановіч не мог не паспрабаваць вызначыць і ролі рэлгіі ў гэтых лёсаносных працэсах, тым больш што тады яна мела даволі шырокае распаўсюджанне ў гушчах народа. Сімпатыі паэта былі на баку колішняй уніяцкай царквы за тое, што ў цяжкія гады гісторыі беларускага народа яна падтрымлівала яго культуру, «з'яўлялася ў краі нібыта нацыянальнай беларускай рэлігіяй. Пачынаючы з канца XVIII стагоддзя, уніяцкім духавенствам на беларускай мове прамаўляліся пропаведзі, выдаваліся рэлігійныя песнапенні і да т. п. Апошняй праявай гэтай дзейнасці з'яўляецца выдадзены ў 1837 годзе беларускі катэхізіс; праз два гады адбылося ўз'яднанне уніятаў, катэхізіс спалены, пропаведзь на беларуская мове забаронена». Такім скупым пералікам падзей і фактаў Багдановіч, напэўна, разлічваў абудзіць у чытача павагу да нацыянальнай рэлігіі продкаў, памяць пра якую, аднак, з году ў год слабела ў народзе. Паэт востра крытыкаваў палітыку Расійскай імперыі і ў адносінах да каталіцкай царквы Беларусі. Вядома, што і гэтая канфесія дзе-нідзе ў дабавачным богаслужэнні выкарыстоўвала беларускую мову, выдавала на ёй рэлігійныя кнігі, і таму, на яго думку, «для наймення каталіцызму польскай верай і нараджаемых адсюль вынікаў не было месца». І толькі пасля таго, «калі з боку ўрада пасыпаліся сістэматычныя ўдары, якія мелі мэтай зніштожыць беларусаў як нацыянальнасць», забаранілі выдаваць па-беларуску кнігі, ужываць беларускую мову ў касцёле, і апошні цалкам перайшоў на польскую мову, у выніку чаго касцёл на Беларусі стаў з'явай польскай, і не дзіва, што той з беларусаў, хто наведваў яго, называў сябе палякам. Таму мне здаецца зусім слушным пастаўленае Багдановічам пытанне: «Міжволі пытаеш сябе: хто ж больш зрабіў для апалячвання беларусаў – паланізатары ці русіфікатары?»

Будучы шчырым прыхільнікам самай шырокай талерантасці ў пытаннях рэлігіі, Багдановіч, вядома ж, ніяк не мог згадзіцца з тым, каб дзейнасць якой-небудзь канфесіі была скіравана на размыванне беларусаў як адзінага этнасу. Глыбокія веды аб ролі рэлігіі ў нацыянальным жыцці беларусаў выявіў Багдановіч у сваёй палеміцы з графам Ігнаццевым, выкарыстаўшы для гэтага ў 1916 годзе магчымасць



Рэпазіторый ГрГМУ